ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
20 СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 36 (1449)

Выходзіць раз у тыдзень

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

## ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ

студэнтаў універсітэта — удзельнікаў заключнага тура X Усесаюзнага конкурсу па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. За высокі ўзровень навуковых работ, пададзеных на конкурс, дыпломам МінВНУ СССР, ЦК ВЛКСМ і Усесаюзнага таварыства «Веды» І ступені ўзнагароджаны І. Крох і У. Семянькоў (гістфак). Дыплом МінВНУ СССР, ЦК ВЛКСМ і Усесаюзнага таварыства «Веды» ІІ ступені атрымала студэнтка гістарычнага факультэта Н. Міськевіч.

Дыплома МінВНУ СССР, ЦК ВЛКСМ і Усесаюзнага таварыства «Веды» ІІІ ступені ўдастоены У. Брайтэр, В. Палубятка, М. Хасэ (гістфак), І. Сташэўская (фізфак). Ганаровай граматай МінВНУ СССР, ЦК ВЛКСМ і Усесаюзнага таварыства «Веды» ўзнагароджаны А. Балцарава, А. Гутавец, Г. Квасіновіч, Л. Каленка, У. Фурс (гістфак), С. Вадкоўская, У. Саўчанка (геафак), Я. Віленскі (механіка-матэматычны факультэт), І. Паромчык (факультэт радыёфізікі і электронікі), Т. Сярак (ФПМ).

З. АЛЯШКЕВІЧ.

## МЕСЯЦ ГІСТОРЫІ

закончыўся нядаўна ў Фаніпальскай сярэдняй школе. З гэтай нагоды на сустрэчу з вучнямі выязджалі студэнты з Афганістана, Конга, Чэхаславакіі і Кубы, што вучацца ў нашым універсітэце. Яны пазнаёмілі школьнікаў з гісторыяй сваіх краін, студэнт з Афганістана расказаў аб піянерскай арганізацыі краіны. Пры дапамозе дыяпазітываў Рауль Гарсія пазнаёміў вучняў з Кубай, з гісторыяй кубінскай рэвалюцыі. Вельмі добра была прынята «Купалінка» ў выкананні чэхаславацкіх студэнтак.

Доўга не сціхалі ў школе песні, якія выконвалі вучні і замежныя студэнты.

Д. ВАЦЛАВІЧОВА,
Я. МОРАНГАВА,
студэнткі з Чэхаславакіі.

## СУСТРЭЧА КАМУНІСТЫЧНЫХ СБА

рэспублікі адбылася ва універсітэце. БДУ не выпадкова стаў месцам яе правядзення, бо адным з першых камуністычных атрадаў у Беларусі быў універсітэцкі СБА імя А. Матросава.

Мінулым летам байцы камуністычных атрадаў працавалі ў дзіцячых дамах, на будоўлях, у сельскай гаспадарцы.

І. ФІНКОЎСКІ,
студэнт факультэта журналістыкі.

● ТСН — У ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС

## АЎТАМАТЫЗАВАНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ СІСТЭМЫ



У практыку вышэйшай школы ўвайшлі розныя віды тэхнічных сродкаў навучання. Гэта вучэбнае кіно і тэлебачанне, лінгафонныя кабінеты, розныя сродкі кантролю, тэхнічныя сродкі на базе ЭВМ і мікрапрацэсарнай тэхнікі. Укараненне ў вучэбны працэс аўтаматызаваных навучальных сістэм (АНС) робіць яго больш індывідуалізаваным і эфектыўным, павышае матывацыю студэнтаў, змяняе характар працы выкладчыка.

Абмеркаванню назапашанага вопыту укаранення АНС у вучэбны працэс ВНУ краіны, распрацоўцы перспектыў правядзення навуковых і практычных работ па аўтаматызацыі навучання ў розных яго формах была прысвечана міжзанальная навукова-метадычная канферэнцыя «Выкарыстанне аўтаматызаваных навучальных сістэм у вучэбным працэсе», якая праходзіла ва універсітэце. У яе рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі вышэйшых навучальных устаноў Масквы, Ленінграда, Кіева, Рыгі, Казані, Новасібірска, Кішынёва, Мінска і іншых гарадоў. У ходзе канферэнцыі працавала тры секцыі. Было прачытана 165 дакладаў.

ШМАТ ЧАСУ прайшло з таго памятнага моманту, калі першы студэнт пераступіў парог першага ў свеце універсітэта і ў яго распараджэнне былі дадзены самы магутны на той час сродак навучання — дошка. Ішоў час, змяняўся студэнт і, вядома, мяняліся тыя сродкі навучання, якія прымянялі выкладчыкі, каб даць студэнтам найбольш трывалыя веды, падрыхтаваць яго добрым спецыялістам. І сёння для нас зусім не дзіўна, што існуюць такія класы, дзе студэнты атрымліваюць веды пры дапамозе аўтаматызаваных навучальных сістэм.

— Вы спытайце ў студэнтаў фізічнага факультэта пра

(Заканчэнне на 2-й і 3-й стар.).

● ЯК ЖЫВЕШ, ГРУПА?

## Моцныя калектывам

**Маё знаёмства з Аленай Аборынай, старастай групы другога курса аддзялення гісторыі КПСС гістарычнага факультэта, адбылося перад пачаткам заняткаў. Алена з цікавасцю аднеслася да просьбы расказаць аб сваёй групе, якую па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі назвалі лепшай акадэмічнай групай універсітэта, расказаць аб тых, хто жыве і вучыцца побач. Гаварыла яна проста, упэўнена. У яе голасе чулася непадробная шчырасць, і я зразумела: калі ў калектыве ёсць такі чалавек, кожны будзе адчуваць двайную адказнасць за даручаную справу.**

ЧАС ПРАЛЯЦЕЎ хутка. У аўдыторыю адзін за другім уваходзяць юнакі і дзяўчаты — тыя, пра каго ідзе размова.

Яны сустрэліся ў мінулым годзе. Маладыя людзі выбралі сваю дарогу ў жыцці: прыехалі на вучобу ва універсітэт. Перад імі стаяла складаная задача станаўлення студэнцкага калектыву, у якім можна было б плённа працаваць і цікава адпачываць. Задача сапраўды складаная, тым больш, што ў групе сабраліся прадстаўнікі адзінаццаці саюзных рэспублік. І кожнага з іх патрэбна зацікавіць, зрабіць так, каб ён як мага хутчэй уліўся ў студэнцкае жыццё, стаў актыўным яго ўдзельнікам. Вялікая адказнасць кладзецца на камсамольскае бюро. Ад работы камсамольскіх актывістаў залежыць і тое, якой будзе пасляхавасць, і тое, якім стане іх студэнцкі калектыў. Непрыкметна праляцелі дні, тыдні, месяцы вучобы, і падышлі студэнты да сваёй першай у жыцці сесіі.

— Якія ж яе вынікі? — пацікавілася я.

— Дрэнныя, — быў адказ.

Хай вас гэта не здзіўляе. Рэзультаты першай сесіі і сапраўды не вельмі добрыя. Прычыны? Іх шмат. І, бадай, галоўная — аднабаковая работа камсамольскага бюро, накіраваная ў асноўным на арганізацыю вольнага часу. Студэнты праводзілі дні імяніннікаў, вечары сярод сяброў з прыгатаваннем нацыянальных страў і г. д. Усё гэта, безумоўна, збліжала студэнтаў, дапамагала ім больш пазнаць адзін аднаго. Але вучоба і самая галоўная перашкода, звязаная з ёю, — моўны бар'ер — засталіся па-за ўвагай.

Пасля сесіі адбыўся камсамольскі сход, на якім вырашылі замацаваць за кожным непаспяваючым студэнтам выдатніка.

Што рашэнне было правільным, пацвердзіла наступная сесія: група выдатна здавала ўсе экзамены, і паспяховасць стала стопрацэнтнай. Прычым пяць студэнтаў здалі сесію толькі выдатна. Сярод іх Алена Байлукова, Валянціна Пячоннікава, Алена Аборына і іншыя. Дарэчы, дзяўчаты паказваюць прыклад не толькі ў вучобе. Яны актыўныя і ў грамадскім жыцці. І наогул, за што б ні браліся студэнты, ва ўсім яны праяўляюць сапраўдны энтузіязм, ініцыятыву.

А як рыхтавалася група да святкавання 40-годдзя вызвалення Беларусі!

**— Часу на падрыхтоўку было мала, — гаворыць Алена Аборына,—але студэнты ўклалі ў сваё выступленне душу. Прадстаўніком кожнай рэспублікі было падрыхтавана па адламу нумару, і ў конкурсе прынялі ўдзел усе без выключэння. Праграма атрымалася эмацыянальная, насычаная. Яшчэ дагэтуль успамінаюць на факультэце, як узнёсла спявала Анаід Танаян з Арменіі, як цудоўна выступалі Х. Салімаў з Таджыкістана і Ларыса Бажога з Малдавіі і многія іншыя.**

Не засталіся студэнты ў баку і ў час правядзення конкурсу газет і тартоў у дні святкавання 50-годдзя факультэта. І калі газету рыхтавалі ўсёй групай, то адказнасць за прыгатаванне тартоў цалкам лягла на плечы дзяўчат. Шмат давялося ім прыкласці намаганняў, каб ні ў чым не падвесці сваю моцную палову.

Акрамя таго, студэнты цудоўна правялі свой трэці семестр. Чацвёра з іх ездзілі ў будатрады: Наталля Чыстая і Таццяна Кахнюк працавалі ў атрадзе «Глорыя», а Алена Аборына і Джусумбек Амураліеў — у атрадзе імя С. Прытыцкага.

А калі да ўсяго сказанага дадаць, што студэнты групы — самыя актыўныя слухачы ФГП, што кожны камсамолец мае даручэнне, то ні ў кога, напэўна, не застанецца сумнення, што званне «Лепшая акадэмічная група» яны сапраўды носяць нездарма.

Л. КАВАЛЬЧУК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

# Ружовы ранак

Марына АБРАГІМОВІЧ

## ПРАЛЕСКІ

*Вясна абдымкі цёплыя і ўсмешкі*
*Дарыла шчодра небу і зямлі.*
*І першыя, як неба сінь, пралескі*
*На досвітку аднойчы ўзышлі.*
*Яны ўздыхнулі лёгка на абшары,*
*Пялёсткі кволыя ўздымалі, як маглі.*
*Малыя, а ўсяму зямному шару*
*Вянок сплялі.*

## СНЕГ

*Ляці, сняжок, ляці, няспынны,*
*Выбоіны і каляіны,*
*Трывогу, жаль зацерушы,*
*прыкрый,*
*схавай!..*
*І на душы*
*Так бела, роўна, як нічога:*
*Я, снег, трывога і дарога.*

## ЛЕС ЗАДЫХАЎ ПРАДЧУВАННЕМ ЛІЎНЯ...

*Лес задыхаў прадчуваннем ліўня,*
*Поўны захаплення, моцы-сілы.*
*Заспявалі вольна і парыўна*
*У вольнай вышыні галіны-крылы;*
*Заспявалі, нібы ў моры хвалі...*
*Вочы прыкрываю ледзь — і бачу:*
*Дрэвы-ветразі, палоненыя даллю,*
*Нібы цацкі ў далонях дзіцячых.*

Леанід ТРУБАЧ

## У КАРЭЛІІ

Ой, рэчка Кепа, не спрачайся
З аслізлым каменем парогаў!
Рыбацкі вечар, паспяшайся:
Тайга — няблізкая дарога.
Агонь атуліць цеплынёю
Святло юначага прызнання,
І рукі — крыллем над табою
У вечаровым нашым ранні.
...Шугалі іскры пад нябёсы
І там, халодныя, знікалі.
А словы біліся аб плёсы,
Як чаек крыкі па-над хваляй.

## ІМГНЕННІ

-1-

Апускалася сонца на плечы
Задуменных увечары дрэў.
Клён пахілы падумаў аб вечным,
Як апошнім лістом дагарэў.

-2-

Цішыню навакольных прастораў
Лось-вандроўнік знянацку абудзіць...
У прыроды не злічыш паўтораў,
Толькі ў нас іх ніколі не будзе.

Жанна ПАХАДНЯ

## МЛЕЧНЫ ШЛЯХ

Млечны шлях маёй надзеі
У туманах блукае, —
Хай туман і не радзее,
Шлях мой не знікае.

Млечны шлях маёй надзеі —
Аж за небакраі!..
Я ў яго, бы ў чарадзея,
Веры не губляю.

Не пытае мяне, дзе я,
З кім я размаўляю, —
Млечны шлях маёй надзеі
Штодня ўваскрасае.

## У РУЧАЙКА ПРАЗРЫСТАГА

У ручайка празрыстага —
хоць кроплю чысціні,
У неба яснавокага —
хоць зорачку натхнення,
У сонейка лагоднага —
праменьчык цеплыні,
У лёсу чарадзейнага
прасіць мне бласлаўлення!..

# Водар жытняга ХЛЕБА...

СЁННЯ ў «Ружовым ранку» ўпершыню выступаюць два першакурснікі — Марына Абрагімовіч і Міхась Скобла. Іх вершы ўжо абмяркоўваліся на пасяджэннях літаб'яднання «Узлёт» і былі цёпла сустрэты калегамі-студэнтамі. Міхась Скобла разам з Валянцінай Місюк, Аленай Забаронак, Жаннай Пахаднёй сёлета сталі ўдзельнікамі штогадовай нарады маладых, якую праводзіць Саюз пісьменнікаў Беларусі ў Каралішчавічах пад Мінскам. Марына Абрагімовіч — мінчанка, Міхась Скобла скончыў Дзярэчынскую сярэднюю школу ў Зэльвенскім раёне на Гродзеншчыне. Іх вершы — не падобныя і разам з тым аб'яднаны не толькі маладосцю светаадчування, светабачання, але і чымсьці большым, што хораша выказала сябе заключнымі радкамі верша Міхася Скоблы: «А да самых далёкіх Галактык водар жытняга хлеба плыве». Гэтае пачуццё Радзімы звязана з далёкімі Галактыкамі, з сённяшнім асваеннем чалавекам космасу — яно само па сабе красамоўна як новае ў нашай маладой паэзіі ўвогуле.

Добра сваімі вершамі стартуе Міхась Скобла. Ды не толькі ён. І, як заўсёды, прадстаўляючы новыя імёны, мы паўтараем: «У добры час!»

Алег ЛОЙКА,
кіраўнік літаб'яднання «Узлёт».



Тамара КАБАНЬКОВА

* * *

*И плескалась радость через край...*
*И сияло солнышко так щедро,*
*Ты у той заветной нашей вербы,*
*Хоть во сне, встречай меня, встречай.*

*Знал бы ты, как я тебя любила...*
*А метель белым-бело мела.*
*Пуще, чем метель, к тебе спешила.*
*Да не я, тропинка... не нашла.*

Міхась СКОБЛА

* * *

Выйшаў месяц да млечнай сцяжынкі
І, на поле зірнуўшы здаля,
Запрашае Сусвет на дажынкі,
Што святкуе планета Зямля.

Запрашае на мове даверу
Слухаць жніўныя сны землякоў,
Запрашае ён Марс і Венеру
Прычасціцца святлом васількоў.

Шчыраваў на ўрадлівым палетку
І яго залаценькі сярпок,
Прытаміўся, і коцяцца зрэдку
Зоркі поту ў блакітны паўзмрок.

Ад гасціннае месячнай ўсмешкі
Пасвятлела на ўтульнай зямлі...
Мы ідзём па духмяным узмежку,
А навокал так пахнуць палі!

Жніўнай песняй прасторы сагрэты,
А ў душы — малады неспакой.
Хай заздросціць планеты Сусвету
Шчодрай, велічнай долі зямной!

Прысак зорных кастроў дагарае,
Сны ў касмічную ноч паплылі...
Мы — зямляне — з табой, дарагая,
Крочыць нам па зялёнай зямлі!

Безліч сцежак, няроўных і гладкіх
Лёс раскідаў па росным траве...
А да самых далёкіх Галактык
Водар жытняга хлеба плыве.

## САМАЕ ПРОСТАЕ

Я многа прайшоў і праехаў дарог,
Юнацкай надзеяй акрылены,
Што недзе, як Млечны, і мой шлях пралёг.
Вярнуўся стамлёны, запылены.

Пабачыў нямала прыгожых мясцін
Пад небам і зорным, і сонечным.
Як лета плыло ў адцвітаўшую сінь,
Сачыў я, над Нарачу стоячы.

Глядзеў, як на месцы палескай дрыгвы
Тчэ сонца прастору пшанічную.
Буслы запрашалі мяне ў паплавы,
Зубры — у Белавеж маляўнічую.

Здавалася часам: знайшоў я свой лёс,
Свой шлях распазнаў я на ростанях,
Ды ўсё ж адчуваў: не хапае чагось,
Як нечага самага простага.

Каб з твару зняць стомленасць марных трывог,
Я збочыў да логу з крыніцаю.
А смагу ўталіўшы, прылёг на мурог
Пад вербы павеўныя, ніцыя.

Ды дрэвы шапталі: «Не спі, паглядзі ж
На самае простае, роднае».
Дзе неба пырнула ў азёрную ціш,
Схілілася хатка самотная.

* * *

Будзеш ехаць па гэтай дарозе,
Азірніся на мой хутарок.
На старым абшарпаным парозе
Затрымай непаволыны свой крок.

Хай жыццё сабе далей прастуе,
Хай дыміцца гарачы гудрон,
Ты прысядзь, я цябе пачастую
Хмельным водарам сцішаных крон.

Скрыгацяць апантаныя колы:
«Кожны міг беражы, беражы.
Не зважай на заносы, праколы,
Не марудзь на крутым віражы».

Спешка веку? Ты простая пешка
У гульні на прасторах Зямлі?
Дзе ж твая асабістая сцежка,
Чалавекам ты станеш калі?

Кінь дарэмна імчаць, мітусіцца,
Азірніся лепш, дружа, назад.
Хай матуля не толькі прысніцца,
Але ўбачыць цябе ля прысад.

Адхісніся ад згубнае спешкі
І Радзіму, і роздуму смак
Прытулі да матулінай ўсмешкі.
Выбачай, як сказаў што не так.

Галіна РАКОЦА

## ПРЫНАЛЕЖНАСЦЬ

Калі ноччу за мной пільна сочаць
Зялёныя вочы зорак

І залаты коўш Мядзведзіцы
Звісае так нізка,
Што можна ім зачарпнуць лёгка
З любой крыніцы жывой вады
І напіцца да ламаты ў зубах;

Калі лугавыя конікі
Рамантуюць стамлёныя смыкі,
Каб на дзівоснай скрыпцы
вучыць іграць;

Калі мяккія рукі соннага ветру
Ласкава горнуць да сябе
І ціха гладзяць па валасах, —
Ведаю, што я — неад'емная часцінка
Сусвету,
І шчаслівая гэтым!

* * *

Як доўга падае зорка з нябёс!
Як балюча, пакутна згарае...
Ні расстанняў,
Ні сустрэч,
Ні ўсмешак,
Ні слёз:
Ты — не ты, я — не я, — другая!..

На каго наракаць:
На выпадак?
На лёс?
Ты мне й ноччу не мог прысніцца...
Лёг на плечы табе
лістападавы ўзрост:
Я спазнілася нарадзіцца!..


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
Зак. 2058. АТ 10601
20 снежня 1984 г.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ